ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР

Антибашистская газета

Башизм - «Репрессивный режим, направленный на подавление прогрессивных общественных движений, на уничтожение демократии».

С.И.Ожегов, «Толковый словарь руского языка», на букву «Ф»

№ 31, декабрь 2007г.

Самые-самые

Победителеи и призеры школьных предметных олимпиад определили, кто же из них самый-самый.

На первом этапе, в школах, свои силы попробовал 851 ученик. На проходивших 8-9 декабря районных олимпиадах за парты сели 264 человека. А самых умных и подготовленных оказалось почти пятьдесят. Это те, кто сумел занять 1-3 места. Полный список лауреатов мы надеемся получить на будущей неделе – в РОНО еще не подвели все официальные результаты. Тем не менее, известно, что определено 11 первых мест, 20 вторых и 27 третьих. Разное их число объясняется тем, что для занятия высокого места соискателю необходимо выполнить не менее 70% заданий (1-е место), 60% (2-е) и 50% (3-е)

Горько!

Девять семейных пар из нашего района, отметивших в этом году 50-летие совместной жизни, получили поздравления и сувениры от Государственного торгового предприятия «Белрыба», которому в этом году исполнилось 50 лет.

Как сообщили в ЗАГСе, акция проводилась по всей стране.

Осталось подсчитать очки

Завершились соревнования последнего из видов городской Спартакиады среди коллективов физкультуры. Определились победители среди шахматистов. Первые три места заняли команды Райбольницы, ИУ-9 войсковой части.

Итоги Спартакиады будут подведены в ближайшее время.

Соб.инф.

Льготы минус

В воскресенье, 16 декабря, тысячи белорусских льготников в последний раз смогут попользоваться последним, пожалуй, из сохранившихся социальных достижений бывшего СССР – льготами. Уж в понедельник платить нужно будет по полной.

О том, чего же лишатся наши не слишком-то социально защищенные граждане, мы постарались выяснить в различных районных службах.

В аптеке сообщили, что в соответствии с новым порядком обеспечения лекарствами права на льготы лишаются все, кто ранее платил 50%. Это почетные доноры, инвалиды 3-й группы, ветераны труда старше 70 лет. В целом, пятидесятипроцентной льготы в аптеках теперь не будет вообще.

По полной стоимости приобретать ранее бесплатные лекарства будут: родители детей, не достигших 3-летнего возраста, узники концлагерей, а ликвидаторы аварии на ЧЭС будут платить 10% от стоимости лекарств.

По словам сотрудниц центральной горецкой аптеки, многие льготники стараются нынче приобрести лекарства впрок, что порождает ажиотаж. Правда, райисполком оплачивает разницу в стоимости своевременно, что позволяет приобретать новые партии препаратов.

По информации транспортников, льготной оплаты проезда с 17 декабря лишаются следующие основные категории граждан: ветераны труда – 50% скидки; бывшие узники – всех видов бесплатного проезда; учащиеся и студенты – 50% скидки; Инвалиды 1 и 2 групп – 50% скидки, «чернобыльцы» - все виды бесплатного проезда; граждане, проживающие на территории радиоактивного загрязнения. – бесплатного проезда с больным ребенком к месту лечения и обратно.

Коснулась отмена льгот и бесплатного зубопротезирования. Оно отменено: для ветеранов труда; членов семей погибших военнослужащих, ликвидаторы аварии на ЧАЭС, инвалиды 3 группы, бывшие узники. ветераны труда.

В сфере коммунального обслуживания скидок лишаются ветераны труда, инвалиды-чернобыльцы, супруги умерших инвалидов (участников) ВОВ.

Кроме этого, эти и некоторые другие категории граждан лишаются ряда других льгот. Подробнее о б этом можно проконсультироваться в соответствующих службах, а также в райисполкоме и Советах депутатов.

Кстати.

Депутат палаты представителей от нашего избирательного округа Татьяна Осмоловская сообщила, что в ходе принятия этого закона она голосовала «За».

Иван МОРОЗОВ

ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР
№ 31, декабрь 2007г.

Лявон Баршчэўскі.

Нарадзіўся 4 сакавіка 1958 г. у Полацку.

1975 г. – паступіў у Менскі пэдагагічны інстытут замежных моваў на спэцыяльнасць нямецкая і ангельская мовы. Працаваў выкладчыкам нямецкай і ангельскай моваў у роднай школе №10 Полацку, потым у Наваполацкім політэхнічным інстытуце.

1987 г. – скончыў асьпірантуру пры Менскім пэдынстытуце замежных моваў.

Кандыдат філялягічных навук. 1990-1995 гг. – дэпутат Вярхоўнага Савету XII скліканьня, уваходзіў у склад парлямэнцкай апазыцыі БНФ. Быў сябрам камісіі ў пытаньнях адукацыі, культуры і захаваньня гістарычнай спадчыны, а таксама сябрам камісіі ў міжнародных справах і замежнаэканамічнай дзейнасьці.

1995 г. – намесьнік старшыні Беларускага народнага фронту "Адраджэньне".

1996-1999 гг. – выканаўца абавязкаў старшыні.

Ад 1999 г. – дарадца старшыні Партыі БНФ.

Заснавальнік і намесьнік дырэктара Беларускага гуманітарнага ліцэю, які цяпер працуе ў падпольлі. БГЛ зачынілі ў 2003.

У 1985 годзе Лявон Баршчэўскі разам зь Сяргеем Шупам стварыў у Менску клюб маладых перакладчыкаў "Бабілён".

Перакладаў Эсхіла, Пэтрарку, Кафку, Брэхта, Ленаў, Бёля.

Перакладае са старажытнагрэцкай, лацінскай, нямецкай, ангельскай, францускай, польскай, гішпанскай. Паводле ўласнага прызнаньня, паэзію перакладаў больш як з трыццаці моваў, а прозу — больш як зь дзесяці. Бегла размаўляе на сямі мовах.

Баршчэўскі – рэдактар сэрыі "Biblioteka białoruska", якая пачала выходзіць у 2006 годзе ва Ўроцлаве ў Калегіюме Ўсходняй Эўропы. У сэрыі ўжо пабачылі сьвет кнігі: "Калі рукаюцца душы" Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна, дзьвюхмоўная кніга Андрэя Хадановіча "Сьвята Новага году", кніга Ўладзімера Арлова "Каханак Яе Вялікасьці".

Адзін з апошніх перакладаў Баршчэўскага — манаграфія нямецкага дасьледніка Бэрнгарда К'яры, якая мае назву "Штодзённасьць за лініяй фронту: акупацыя, калябарацыя і супраціў у Беларусі (1941-1944 г.)".

У мінулыя выходныя ў актавай залі Палаца культуры МАЗа прайшоў дзясяты з'езд партыі "Беларускі народны фронт". У адпаведнасьці са Статутам, кіраўніцтва партыі справаздачылася за апошнія два гады, пасьля чаго адбыліся выбары новага кіраўніцтва.

У адрозьненьні ад папярэдніх з'ездаў, на гэтв раз пасаду лідэра партыі аспрэчвалі ажно трое прэтэндэнтаў – Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч і Алесь Міхалевіч. Галасаваньне было доўгім і бурным, у рэшце аніводзін з прэтэндэнтаў не набраў неабходных 50% плюс адзін голас.

У гэтай сытуацыі партыя здолела падцьвердзіць статус адной з найбольш дэмакратычных структураў краіны. У патавай сытуацыі ініцыятыву ўзяў на сябе вэтэран Фронту Лявон Баршчэўскі, вылучыўшы сваю кандыдатуру ў якасьці кампраміснай. Ен і быў абраны старшыней.

Намесьнікамі сталі Вінцук Вячорка, Алесь Міхалевіч, Юрась Губарэвіч, Аляксей Янукевіч і Віктар Івашкевіч.

З'ЕЗД ПАРТЫІ БНФ ВАЧЫМА ЭКСПЕРТАЎ

Па сканчэнні з'езду эксперты разважаюць, што можа змяніць новы лідэр Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі і ці паглыбіцца ў партыі раскол.

Палітолаг **Юрый Чавусаў** кажа, што абранне **Лявона Баршчэўскага**, якога нават не было ў спісе кандыдатаў, гэта кампрамісны варыянт для ўсіх. Але пры гэтым новы старшыня Партыі БНФ будзе праводзіць тую ж стратэгічную лінію, што і яго папярэднік, мяркуе эксперт.

- Лінія БНФ на супрацоўніцтва з дэмакратычнай і партыйнай кааліцыяй АДС застанецца нязменнай. Спадар Баршчэўскі – сапраўды кампрамісная фігура па персанальных спрэчках, але ў пытанні стратэгічнага развіцця партыі – гэта пацверджанне лініі ***Вінцука Вячоркі****.*

Адзін з лідэраў Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ **Юрый Беленькі** на пачатку нашай размовы адразу падкрэсліў, што партыя, на чале якой стаў Лявон Баршчэўскі, не мае аніякага дачынення да той структуры, якая была створана 19 год таму. Партыя БНФ адыйшла ад канцэптуальнай ідэі і перайшла на пазіцыі прагматызму ў палітыцы, мяркуе намеснік **Зянона Пазьняка**. Пры гэтым палітык заўважае, што новы старшыня БНФ Лявон Баршчэўскі – на галаву вышэй за іншых прэтэндэнтаў на пасаду.

- Я як бы даю аванс яму на сёння. Магу здагадвацца, што няма ў Лявона Баршчэўскага шмат якіх якасцяў, якія ёсць, скажам, у Зянона Пазняка. А раптам адбылося нешта за гэтыя гады - і гэтыя якасці з'явіліся. Калі б так было, то можна з аптымізмам глядзець на дадзеную сітуацыю. Такі чалавек, як Баршчэўскі, мог быць вельмі карысным у камандзе, але за спіной лідэра.

Пісьменнік **Уладзімір Арлоў** – адзін з тых, хто стаяў ля вытокаў БНФ пры канцы 80-х і заўжды прымаў актыўны ўдзел у партыйных справах. Ён мяркуе, што апошні з'езд партыі паказаў, што наспелі ўнутраныя рэформы, гэта засведчыла тое, што сярод пяці намеснікаў старшыні партыі – чатыры маладыя палітыкі. Але галоўны вынік з'езду, на меркаванне Уладзіміра Арлова, гэта тое, што атрымалася пазбегнуць расколу ў партыі.

- Рады гэтаму, бо раскол быў вельмі рэальны. І трэба аддаць належнае Лявону Баршчэўскаму, які ў гэтай складанай сітуацыі прыняў, на маю думку, даволі спантаннае, але разам з тым і мудрае рашэнне – сваёй асобай здолеў аб'яднаць дэлегатаў, якія падзяліліся амаль што фіфці-фіфці.

Аналітык **Аляксандр Класкоўскі** згодны з Уладзімірам Арловым, што сітуацыю ўдалося ўратаваць на дадзены момант. Але ці ўратуе гэты кампраміс саму структуру – пытанне вялікае, на думку палітолага.

- Нельга бясконца толькі крызы ўнутры партыі ўладкоўваць. Дзеля чаго існуюць партыі, калі ўсё абмяжоўваецца толькі бурамі ў шклянцы вады!? А ўсе гэтыя прыгожыя заклікі, што мы мусім стаць лідэрамі грамадскай думкі, павесці за сабой шырокія дэмакратычныя масы - яны гучаць проста як манілаўскія пражэкты.

Сам новаабраны старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі ў сваім першым інтэрв'ю ў новым статусе заявіў, што ў апошнія гады Фронт працаваў не на сваю карысць, а дзеля аб'яднаных сілаў. *"Нам трэба весці кааліцыйныя перамовы як моцнаму партнёру, а не як падпарадкаванаму. Трэба, каб з Фронтам лічыліся.Вось гэта наша праграма дзейнасці"*, - заявіў Лявон Баршчэўскі.

Сяргей БУДКІН

Дзіцячы ўзрост

3
ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР
№ 31, декабрь 2007г.

Вось мінулі ўжо цэлых 16 год ад ужо далёкага, а для каго і не 1991 года, калі з разводам СССР мы атрымалі фактычную незалежнасць. Тады мне было 18 гадоў, таму сьмела магу казаць, што ўсё маё дарослае жыццё прайшло ў незалежнай Беларусі. У маладым узросьце чалавек хутка навучаецца, спасьцігаючы розныя інстытуцкія дысцыпліны ды праходзячы скрозь "жыццёвыя ўнівэрсітэты". Таму мне заўжды было незразумела, чаму дарослыя дзядзькі з уладных кабінетаў, якія маюць па нашых мерках неблагую адукацыю, у рэальным жыцці пры прыняцці рашэньняў кіруюцца не лёгкай, не навуковай базай, а нейкімі ўласнымі забабонамі. І толькі з гадамі я пачаў разумець іх.

У асноўным гэта праблема палягае ў тым, што людзі, якія сёньня кіруюць нашай краінай (вертыкаль, міліцыя, КДБ, дырэктарат), сфарміраваліся як асобы яшчэ ў савецкія гады. Тады ініцыятыва заўсёды каралася. Пра разумнага казалі з асуджэньнем: "Вось які разумнік знайшоўся!". Крацей квітнелі тупасць, абібоцтва, лісьлівасць і. г.д. Далёка не самыя лепшыя чалавечыя якасці.

З набыцьцём незалежнасці з'явілася процьма свабоднай інфармацыі і магчымасьцяў яе атрымаць. Таму той, хто не ленаваўся, здолеў хутка набыць новыя веды і досьвед. Але, нажаль (зноў вяртаемся да вышэй згаданага), тое, што ў маладосці ўцмоктваеш на лёце, у астатнія гады перажоўваеш сто разоў, пакуль зразумееш новы смак.

Нельга казаць, што наша ўлада за гэтыя гады нічаму не навучылася. Безумоўна, пэўны праргэс ёсць. Але гэта – вельмі малая частка ад таго, што патрабуе ўсьвядоміць час. Бо пакуль нашы " дыназаўры камунізму" эвалюцыянуюць да людзей сусветнага ўзроўню, ёсць шанец загнуцца ў сёняшнім жабрацтве не аднаму пакаленьню беларусаў. Робячы з года ў год "ляпы" у эканаміцы, нашы ўлады апошнім часам загнамі сябе ў пастку, выйсьце з якой знайсці вельмі складана нават карыфеям эканомікі з Міжнароднага валютнага Фону і Сусьветнага Банку.

Але нашы яго і не адразу кінуліся шукаць, тое выйсьце. Раз няма сродкаў на добрае жыццё і ежу, будзем карміць народ ідэялогіяй. І адразу панабіралі цэлыя штаты ідэёлягаў. З тэлеэкранаў, газэтаў і радыёкропак іл'юцца пераможныя гімны. Перамагаем, то ураджай, то ільготы, то цэны, то заробкі. Але годнага жыцця як не было, так і не праглядаецца. Адразу мала што зробіш. Бо гэта праблема тычыцца не толькі ўлады, а бадай усяго нашага грамадзтва. Мы ўсё ячшэ знаходзімся ў дзіцячым узросьце. Усяго шаснаццаць год. І каб прысьпешыць надыход лепшых часоў, паважаныя землякі, трэба пачынаць зьмены з сябе. Як маўляў той клясык, кожны дзень выціскаць з сябе па кроплі раба. І расьці. Расьці думкамі, розумам, душой. І дай Бог, каб мы ўсе ў нашай краіне пераросшы дзіцячы ўзрост перарасьлі і дзіцячы розум.

Андрэй ЮРКОЎ, тэл. 623 61 08

Магілёў: ад актывісткі патрабуюць сплаціць штрафы

Судовыя выканаўцы Ленінскага суду Магілёва запатрабавалі ад моладзевай актывісткі Тацяны Буланавай тэрмінова сплаціць тры штрафы, якімі яе пакаралі Салігорскі і Баранавіцкі раённыя суды ды адміністрацыйная камісія Ленінскага райвыканкаму Магілёва. Агульная сума штрафаў складае 341 тысячу рублёў.

У верасьні Тацяна Буланава ўдзельнічала ў акцыях салідарнасьці падчас судоў над маладафронтаўцамі Іванам Шылам у Салігорску і Яраславам Грышчэнем у Баранавічах. Там яе, разам зь іншымі ўдзельнікамі акцыяў, затрымалі і пакаралі штрафамі ў памеры сто дваццаць чатыры тысячы і шэсьцьдзесят дзьве тысячы рублёў.

Адміністрацыйная камісія Ленінскага райвыканкаму пакарала актывістку, нібыта за расклейваньне партрэтаў Віктара Дашкевіча, штрафам у памеры 155 тысяч рублёў. Ленінскі суд Магілёва, куды зьвярнулася са скаргай Тацяна Буланава, пакінуў вырак камісіі ў сіле.

Актывістка разам з праваабаронцамі зьбіраецца абскарджваць пастанову камісіі ў судах вышэйшай інстанцыі.

Чавес признал поражение на референдуме

Президент Венесуэлы Уго Чавес проиграл на референдуме по реформе конституции страны. Он признал свое поражение, сказав: "Мы не могли этого сделать, не могли сейчас".

Проект конституционной реформы предполагал многочисленные поправки и изменения действующего основного закона. Реформы, среди прочего, предусматривали снятие ограничений на срок пребывания президента у власти.

По словам президента Уго Чавеса, новая конституция должна была претворит в жизнь его мечты о социализме XXI века в Венесуэле.

Чавес утверждал, что намеченные перемены вернут власть народу, но критики считали, что он лишь сконцентрирует власть в своих руках.

В столице страны Каракасе была отмечена высокая явка на избирательные участки. Люди стояли в очередях по несколько часов, чтобы проголосовать.

"Мы примем любые результаты голосования. Венесуэльцы никогда еще не голосовали так часто, как в последние девять лет, после свершения мирной и демократической революции", - заявил Уго Чавес после закрытия избирательных участков.

Реформы президента

Главной реформой, намечавшейся президентом, являлась отмена конституционного положения об ограничении количества сроков переизбрания президента.

Кроме того, проект предполагал переход Центрального банка страны под контроль президента, а также создание новых провинций, которые бы подчинялись центру.

Уго Чавес также предлагал урезать рабочий день до шестичасового, и объявить 16 лет возрастом, дающим право на участие в выборах, вместо 18, как это было ранее.

Всего президент предложил внести в конституцию страны 33 изменения.

Критики президента Чавеса обвиняли его в стремлении к узурпации власти, а сторонники настаивали на том, что реформы помогут укрепить демократию в Венесуэле.

BBCRussian.com

Магілёў: донараў падтрымала ПАРЭ

Радыё Свабода На зварот аргкамітэту дабрачыннага фонду донараў "Кропля жыцьця" Парлямэнцкая Асамблея Рады Эўропы даслала шэраг дакумэнтаў, якія рэглямэнтуюць дачыненьні донараў і донарскіх арганізацыяў зь дзяржавай у краінах Эўразьвязу. Праблема з донарскай крывёй у Магілёве застаецца.

У суправаджальным лісьце сакратар асамблеі Геза Мээй выказала ўдзячнасьць ад імя генэральнага сакратара Асамблеі Матэа Сарынаса за ўзьнятыя ў Беларусі праблемы донарства.

Актывісты беларускай донарскай арганізацыі атрымалі рэкамэндацыі, паводле якіх дзейнічае сыстэма донарства ў краінах Эўразьвязу, а таксама эўрапейскія стандарты донарства ды некаторыя іншыя дакументы...

Старшыня аргкамітэту Ігар Каваленка лічыць ліст з Парлямэнцкай Асамблеі Рады Эўропы вельмі важным:

"У краінах Эўразьвязу менш праблемаў з донарамі, чым у нас у Беларусі, бо там дзяржава падтрымлівае донараў рознымі сродкамі. У Беларусі наадварот — усе льготы і ўсю падтрымку адмянілі".

Магілёўскія донары зьвярнуліся ў Парлямэнцкую Асамблею Рады Эўропы пасьля заяваў беларускіх чыноўнікаў, што скасаваньне льготаў донарам — нібыта патрабаваньне Рады Эўропы.

"Як я і меркаваў, Эўразьвяз ніяк ня ціснуў на беларускіх чыноўнікаў, каб яны скасавалі льготы", — зазначае Ігар Каваленка.

Усе дакумэнты на ангельскай мове — пасьля перакладу донары-актывісты распаўсюдзяць іх у дзяржаўных мэдычных установах.

Тым часам у Магілёве праблемы з донарамі застаюцца. Донары не ідуць здаваць кроў.

Гаворыць галоўны лекар Магілёўскай станцыі пераліваньня крыві Барыс Гольдэнбэрг:

"Мы цяпер перайшлі да актыўнага пошуку донараў. Выяжджаем у раёны, прадпрыемствы, установы. Выезды на наступны год плянуем рабіць часьцей. Гэты графік узгадняецца з аблвыканкамам і даводзіцца да органаў выканаўчай улады — гэта будзе дзяржаўным заданьнем".

Льготаў у донараў не засталося, лічыць Барыс Гольдэнбэрг: "На сёньняшні дзень, калі нічога ня будзе вырашана, то 16-га чысла застануцца толькі, я б сказаў, наміинальныя льготы. Льготы на зубапратэзаваньне адмянілі. Пакуль толькі дабаўка да пэнсіі застаецца".

Паводле Барыса Гольдэнбэрга, у Магілёўскім аблвыканкаме яшчэ няма рашэньня пра бясплатны праезд ганаровым донарам.

Дзяржаўныя прафсаюзы абяцаюць падчас заключэньня калектыўных дамоваў улічваць інтарэсы ганаровых донараў. Ім будуць выплачваць дадатковыя прэміі.

Абяцаюць таксама даваць ганаровым донарам харчовыя і рэчавыя гуманітарныя пакеты.

За аднаразовую здачу крыві донар атрымлівае блізу 70 тысяч рублёў, за здачу плязмы — каля 120 тысяч.

У чэрвені магілёўскія донары праводзілі папераджальны страйк супраць скасаваньня льготаў.

ЗА ДВА ДНІ - 20 ЗАГІНУЛЫХ НА ДАРОГАХ

Паводле ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі, 30 лістапада - 1 снежня зарэгістравана 51 сур'ёзнае ДТЗ, у якім 20 чалавек загінулі, 47 атрымалі цялесныя пашкоджанні рознай ступені цяжкасці.

Толькі ў суботу ў краіне адбыліся 22 такія аварыі, у якіх 11 чалавек загінулі, 18 атрымалі цялесныя пашкоджанні.

У Мінску за мінулыя суткі адбылося 67 ДТЗ, у чатырох з іх пацярпелі 7 чалавек. Супрацоўнікі ДАІ выявілі 1 снежня ў сталіцы 870 парушэнняў правілаў дарожнага руху, затрымана 16 п'яных вадзіцеляў, 18 — без вадзіцельскіх праў і 137 — за перавышэнне хуткаснага рэжыму. 74 пешаходы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў пераходу праезнай часткі дарогі, з іх 26 — за невыкарыстанне ў цёмны час сутак святлоадбівальных элементаў

Дзяржаўтаінспекцыя заклікае вадзіцеляў быць як мага больш асцярожнымі на дарогах у сувязі са складанымі ўмовамі надвор'я, а пешаходаў — абавязкова абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі

Требуются на работу:

ОАО Строитель
Инженер ПТО

УКСП Горецкое
Рабочие на переборку и затарку овощей.
Расценки за 1 т: Картофель и морковь – 7т.
Свекла – 5т.
Лук – 10т.

Узел почтовой связи:
Инженер-электроник
Инженер-механик

Тепловая энергетика
Слесарь теплосетей

БГСХА
Мастер производственного обучения, Зав. учебным полигоном, машинист котлов, слесарь котельной, слесарь-сантехник, кондитер

Прометей
Кровельщик, каменщик, плотник, штукатур

Према
Слесарь-инструментальщик
Литейщик

АТП-17
Слесарь-моторист

РайПО
Рабочие на переборку картофеля, продавцы, официанты

Комбинат общепита
Главный бухгалтер, администратор

ПМК-1
Инженер по ТБ, мастер

Детсад №4
Рабочий 0,5 ст., воспитатель (подмена отпуска)

По данным Центра занятости

«ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР»
Антибашистская газета.
№31, декабрь 2007г.
Издатель и главный редактор - ЭДУАРД БРОКАРЕВ.
Brok61@yandex.ru
Т. 545 89 83. Издание непериодическое, выходит по мере возможности.
Тираж 299 экземпляров.
В номере использованы материалы сайтов:
svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.home.pl; www.horki.info; uzgorak.na.by